*Л. І. Масейчук*
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, Мінск

*L. Maseichuk*
Belarusian National Technical University, Minsk

**УДК 94(476):94(470)**

# ФАРМІРАВАННЕ МАДЭЛІ КІРАВАННЯ БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭТАМ У ПЕРШЫЯ ГАДЫ ЯГО ПРАЦЫ

# FORMATION OF THE MANAGEMENT MODEL OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY IN THE FIRST YEARS OF WORK

*Артыкул прысвечаны фарміраванню мадэлі кіравання Беларускім дзяржаўным універсітэтам у першыя дзесяцігоддзі яго працы. На падставе праведзенага аналізу нарматыўна-прававой дакументацыі былі выдзелены два этапы станаўлення адміністрацыйнага ўладкавання БДУ. Вызначана, што да канца 1930-х гг. структура кіравання ўніверсітэтам была сфарміравана і адпавядала патрабаванням пануючай ідэалагічнай мадэлі ў краіне.*

*Ключавыя словы: вышэйшая адукацыя; універсітэт; кіраванне; адмністрацыйная структура; студэнты; палітыка; факультэт.*

*The article is devoted to the formation of the management model of the Belarusian State University in the first decades of its work. On the basis of the analysis of regulatory and legal documentation, two stages of formation of the administrative arrangement of BSU were identified. It was determined that by the end of the 1930s. the management structure of the Belarusian University was formed and met the requirements of the prevailing ideological model in the country.*

*Keywords: higher education; university; management; administrative structure; students; policy; faculty.*

Асноўным адміністрацыйна-кіруючым органам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (далей – БДУ), які пачаў сваю працу 30 кастрычніка 1921 г., было Праўленне. У склад Праўлення БДУ ўваходзілі: рэктар, два яго намеснікі і па аднаму прадстаўніку ад выкладчыкаў і студэнтаў (разам 5 чалавек). Першапачаткова ўсе пасады был выбарнымі. Але пачынаючы з сярэдзіны 1920-х гг. члены Праўлення назначаліся загадам Наркамасветы БССР тэрмінам на адзін год. У кампетэнцыі Праўлення знаходзіліся пытанні вучэбна-навуковай і гаспадарча-адміністрацыйнай дзейнасці ўніверсітэта [1, арк. 187]. Праўленне БДУ працавала ў цесным кантакце з усімі мясцовымі ўрадавымі органамі і найперш з СНК БССР.

Агульнае кіраўніцтва вышэйшай навучальнай установай ускладалася на Савет БДУ. Узначальваў Савет рэктар, які ў той жа час быў і старшынёй Праўлення ўніверсітэта. Першым рэктарам і старшынёй Праўлення БДУ стаў У. І. Пічэта (1921–1930).

Пасяджэнні Савета праходзілі адзін раз у тры месяцы. У Савет БДУ ўваходзіла па 5 прадстаўнікоў ад прафесараў, выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта, што ў агульнай колькасці складала 20 чалавек. Акрамя таго, у пасяджэннях Савета БДУ прымалі ўдзел прадстаўнікі наркаматаў і прафесійных арганізацый Беларусі: Саўпрафбела, Прафсаюза працаўнікоў асветы і Медыкасанпрацы, мясцкама ўніверсітэта, Саўнаркама, Наркамасветы, Наркамздрава, Наркамфіна, Саўнаргаса, Цэнтрабелсаюза і Мінскага гарвыканкама [2, с. 162].

У кампетэнцыі Савета БДУ знаходзіліся пытанні навуковай і навукова-адукацыйнай дзейнасці, супрацоўніцтва з іншымі навучальнымі ўстановамі і навукова-даследчымі інстытутамі, у тым ліку і міжнароднымі.

На Савеце абмяркоўваліся прапановы аб удасканаленні структуры ўніверсітэта, абіраліся кіраўнікі прэзідыумаў факультэтаў, разглядаліся заявы аб прызначэнні пенсій, матэрыяльных кампенсацый і іншых грашовых выплат работнікам, заслухоўваліся справаздачы рэктара БДУ, прарэктараў і дэканаў аб выкананні планаў работы ўніверсітэта і яго структурных падраздзяленняў, аб выніках гаспадарчай дзейнасці і інш. У першыя гады дзейнасці ўніверсітэта на пасяджэннях Савета абіралася Праўленне БДУ. Пазней – вылучаліся кандыдаты ў Праўленне.

Рашэнні Савета БДУ афармляліся пратаколам і ўступалі ў юрыдычную сілу пасля падпісання рэктарам. Такія пастановы былі абавязковымі для ўсіх структурных падраздзяленняў універсітэта.

Такім чынам, выканаўчая ўлада належыла зацверджанаму Наркамасветай БССР калегіяльнаму органу кіравання – Праўленню, членам і старшынёй якога быў рэктар. Кантралюючым органам з'яўляўся Савет, у які ўваходзілі прадстаўнікі ўніверсітэцкай грамадскасці.

Як і любая іншая савецкая вышэйшая навучальная ўстанова, БДУ падзяляўся на факультэты, на чале якіх стаяў дэкан. Дэкан аднаасобна адказваў перад Праўленнем БДУ за ўсё, што адбывалася на факультэце [1, арк. 17].

Справы, якія тычыліся толькі факультэтаў, былі выключна ў юрысдыкцыі Прэзідыумаў факультэтаў пад агульным кантролем Праўлення ўніверсітэта. Прэзідыумы факультэтаў кіравалі ўсёй адміністрацыйнай, навучальнай, навуковай і фінансавай дзейнасцю падраздзялення. Таксама ў іх абавязкі ўваходзіў кантроль за правядзеннем уступных іспытаў. У склад Прэзідыума факультэта ўваходзілі дэкан і два члены Прэзідыума (адзін прадстаўнік з ліку навуковых работнікаў, другі – са студэнцкай моладзі), якія назначаліся Праўленнем.

Прэзідыум факультэта меў права ствараць новыя факультэцкія аддзяленні. На чале такіх аддзяленняў стаялі Саветы, у склад якіх уваходзілі прадстаўнікі навукова-педагагічных работнікаў і студэнцкія дэлегаты. Прэзідыум Савета аддзялення абіраўся шляхам адкрытага галасавання і зацвярджаўся Праўленнем БДУ.

Такім чынам, кіруючымі органамі факультэта з'яўляліся Прэзідыум і Савет факультэта.

Пытанні, якія тычыліся адной або некалькіх роднасных дысцыплін, што выкладаліся ў БДУ, знаходзіліся ў юрысдыкцыі Прадметных камісій пад агульным кантролем і кіраўніцтвам Прэзідыума факультэта. Колькасць прадметных камісій вызначалася Прэзідыумам факультэта і зацвярджалася Праўленнем універсітэта [1, арк. 18 зв.].

У склад Прадметнай камісіі ўваходзілі ўсе навуковыя работнікі, аб'яднаныя роднаснымі дысцыплінамі, а таксама прадстаўнікі студэнтаў. Колькасць прадстаўнікоў студэнцтва была роўнай палове навуковых работнікаў. З прафесараў абіраўся старшыня прадметнай камісіі, а таксама яго намеснік і сакратар. Яны складалі бюро прадметнай камісіі, склад якога зацвярджала Праўленне БДУ.

Сярод мноства пытанняў, якія разглядаліся на пасяджэннях камісій, можна вылучыць некалькі вялікіх груп: першая – кадравыя пытанні: фарміраванне штатаў, прыём на працу і перавод супрацоўнікаў факультэта, камандзіраванне (у тым ліку за мяжу) выкладчыкаў і асістэнтаў, звальненні, узнагароджанні, прэміраванне і інш.; другая – праблемы, звязаныя са студэнцкім кантынгентам: залічэнне, заахвочванне/пакаранне, камандзіраванне, адлічэнне і г. д.; трэцяя – задачы фінансава-гаспадарчага забеспячэння факультэта, фарміраванне бібліятэчнага фонду, размеркаванне вучэбных аўдыторый і жылых памяшканняў [3, арк. 10–21 зв.] і інш.

Неабходна падкрэсліць, што праца Саветаў факультэтаў і Прадметных камісій была накіравана, перш за ўсё, на вырашэнне адукацыйных задач. Таму цалкам натуральна, што ў кампетэнцыі прадметных камісій знаходзіліся пытанні, звязаныя з арганізацыяй навучальнага працэсу, зацвярджэннем вучэбных планаў і праграм курсаў па спецыяльнасцях, фарміраваннем метадычных камісій і арганізацыяй прыёмнай кампаніі, размеркаваннем вучэбнай нагрузкі, падрыхтоўкай вучэбнага раскладу па спецыяльнасцях і курсах. За імі было замацавана права падбору кандыдатаў на прафесарскія і выкладчыцкія пасады [4, арк. 27–34, 50–57 зв.].

У. І. Пічэта (першы рэктар БДУ) у 1924/1925 навучальным годзе адзначаў, што Прадметныя камісіі па гістарычных дысцыплінах «былі тым месцам, дзе чыталіся даклады і абараняліся працы, аўтары якіх прэтэндавалі на атрыманне звання выкладчыкаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце» [5, арк. 12].

Аднак, як паказала практыка, Прэзідыумы факультэтаў і Прадметныя камісіі не спраўляліся з ускладзенымі на іх задачамі. Выкладчыкі, як і прадстаўнікі студэнцтва, нярэдка прапускалі пасяджэнні Прэзідыумаў і Прадметных камісій, у выніку іх праца перастала насіць сістэматычны характар.

Да канца 1920-х гг. унутраная дзяржаўная палітыка ўзяла курс на паскораную індустрыялізацыю краіны. Разам з гэтым змянілася і адміністрацыйная мадэль вышэйшай школы.

У маі 1929 г. на чарговай рэктарскай нарадзе ў г. Маскве было прынята рашэнне аб неабходнасці карэннага перагляду кіравання вышэйшымі

навучальнымі ўстановамі СССР. Летам 1929 г. пры Наркамасветы РСФСР была створана камісія па падрыхтоўцы новага Палажэння аб вышэйшай адукацыі. Гэты дакумент быў ухвалены на ўсесаюзнай нарадзе кіруючых работнікаў вышэйшай школы, якая праходзіла з 8 да 14 студзеня 1930 г. [6].

Згодна з зацверджаным палажэннем, у БДУ былі скасаваны Праўленні і Прэзідыумы, ліквідаваны Прадметныя камісіі [6]. Адмянялася не толькі выбарнасць рэктара (яго сталі называць дырэктар), але і дэканаў факультэтаў (афіцыйна з гэтага часу яны сталі называцца загадчыкамі). Саветы факультэтаў скасоўваліся, а студэнцкія прадстаўнікі былі адкліканы з праўленняў і дэканатаў [7, с. 126].

У выніку сістэма кіравання стала вельмі складанай і заблытанай. Адсутнічаў выразны падзел працы і адказнасці за якасць і вынікі дзейнасці. Адзінаначалле абвяшчалася толькі на паперы. БДУ знаходзіўся ў стане поўнай адміністрацыйнай разрухі.

У гэты ж час у рамках рэалізацыі сумеснай пастановы ЦВК і СНК СССР «Аб рэарганізацыі ВНУ, тэхнікумаў і рабфакаў» ад 23 ліпеня 1930 г. [8] і рашэння СНК РСФСР «Аб рэарганізацыі сістэмы падрыхтоўкі ўрачэбных кадраў» ад 19 чэрвеня 1930 г. [8] калегіяй СНК БССР са складу БДУ быў выведзены шэраг факультэтаў, на базе якіх былі заснаваны самастойныя інстытуты.

У выніку пераўтварэнняў на базе медыцынскага факультэта быў створаны медыцынскі інстытут. Факультэт гаспадаркі і права стаў асновай для планава-эканамічнага, фінансава-эканамічнага інстытутаў і інстытута спажывецкай кааперацыі (з 1933 г. інстытут народнай гаспадаркі). На базе факультэта права і савецкага будаўніцтва адкрылі інстытут савецкага будаўніцтва і права. Два аддзяленні педагагічнага факультэта (сацыяльна-гістарычнае і літаратурна-лінгвістычнае) былі пераўтвораны ў Вышэйшы педагагічны інстытут.

Ва ўмовах, што склаліся ў той час, неабходнасць рэарганізацыі адмінстрацыйнай структуры ўніверсітэта была відавочнай.

19 верасня 1932 г. ЦВК СССР прыняў рашэнне «Аб навучальных праграмах і рэжыме ў вышэйшых школах і тэхнікумах» [8], якое істотна змяніла структуру ўнутраннага кіравання ўніверсітэтам.

Згодна з пастановай пасада рэктара была ліквідавана. На чале БДУ стаяў дырэктар, які нёс адказнасць за кіраўніцтва навучальнай установай перад Наркамасветы БССР, арганізацыю вучэбнага працэсу, падрыхтоўку савецкіх спецыялістаў, навукова-выдавецкую дзейнасць і адміністрацыйна-гаспадарчую працу. Пад яго старшынствам быў арганізаваны Савет БДУ, у склад якога ўваходзілі намеснікі дырэктара па вучэбнай і навуковай працы, памочнік па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы, дэканы факультэтаў, дырэктары навукова-даследчых устаноў БДУ, загадчыкі кафедраў. Па прадстаўленні дырэктара ў яго маглі ўключацца дырэктар бібліятэкі і прадстаўнікі партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый універсітэта.

Была дакладна вызначана роля кафедраў і факультэтаў як асноўных вучэбных і навуковых падраздзяленняў універсітэта. Загадчык кафедры аднаасобна адказваў за яе працу, за якасць і своечасовасць падрыхтоўкі праграмы заняткаў, за метады вучэбнай работы, за падбор выкладчыкаў і іх працу.

У выніку рэарганізацыі ўніверсітэт набыў новае аблічча. Згодна з рашэннем СНК БССР «Аб рабоце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта» ад 24 мая 1934 г. яго галоўнай задачай стала падрыхтоўка спецыялістаў, якія добра валодаюць асновамі фундаментальных навук для вышэйшых навучальных устаноў [9, с. 49]. Дзеля гэтага да пачатку 1936/1937 навучальнага года ва ўнверсітэце было арганізавана пяць факультэтаў і рабфак, адкрыты 23 кафедры.

Сур'ёзным стрымліваючым фактарам развіцця ўніверсітэта стала рэпрэсіўная палітыка дзяржавы ў дачыненні да прафесарска-выкладчыцкага складу, супрацоўнікаў і студэнтаў БДУ. Абвастрэнне ідэалагічнага супрацьстаяння ва ўніверсітэце ў межах разглядаемага перыяду развівалася па ўзыходзячай.

Склаўшаяся мадэль упраўлення БДУ была зацверджана пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 23 чэрвеня 1936 г. «Аб рабоце вышэйшых навучальных устаноў і аб кіраўніцтве вышэйшай школай». Дакументам падкрэслівалася, што «ва ўмовах перамогі сацыялізму, <…> да вышэйшых навучальных устаноў павінны быць прад'яўлены новыя, больш высокія патрабаванні, якія забяспечваюць падрыхтоўку высокакваліфікаваных, палітычна выхаваных, усебакова адукаваных і культурных кадраў» [8]. Асабліва падкрэслівалася, што адзінаначалле дырэктараў вышэйшых навучальных устаноў не павінна парушацца «адміністраваннем з боку грамадскіх арганізацый», а дырэктарам, у сваю чаргу, забаранялася «перадавяраць шэраг асноўных функцый кіравання другарадным асобам» [8]. Дакумент таксама вызначаў патрабаванні да кандыдатаў на асноўныя кіруючыя пасады ў вышэйшых навучальных установах.

Згодна з пастановай на чале БДУ стаяў дырэктар. Дырэктар павінен быў мець закончаную вышэйшую адукацыю і досвед навукова-педагагічнай і/ці вытворчай працы. Зацвярджаў і вызваляў дырэктара СНК БССР па прадстаўленні Наркамасветы БССР або ЦК КП(б)Б, якія, у сваю чаргу, мелі права накладаць адміністрацыйныя спагнанні на кіраўніка ўніверсітэта. Штогод дырэктар БДУ выступаў са справаздачным дакладам аб дзейнасці ўніверсітэта на пасяджэнні Наркамасветы БССР, дзе давалася афіцыйная ацэнка вынікам яго працы [10, арк. 26–27].

Намеснік дырэктара па вучэбнай і навуковай рабоце абіраўся з ліку найбольш кваліфікаваных прафесараў БДУ. Вылучэнне кандыдатаў на гэтую пасаду магло адбывацца па ініцыятыве дырэктара ўніверсітэта, партыйнай арганізацыі БДУ і/альбо па распараджэнні Наркамасветы БССР. Права канчатковага зацвярджэння і зняцця з пасады намесніка дырэктара было толькі ў Наркамасветы БССР.

Суіскальнікі на пасаду дэкана факультэта зацвярджаліся начальнікам упраўлення навучальных устаноў Наркамасветы БССР па прадстаўленні дырэктара БДУ. Дэканы ажыццяўлялі аднаасобнае кіраўніцтва вучэбнай і навуковай працай факультэта.

На пасаду загадчыка кафедры маглі прэтэндаваць асобы, якія мелі званне прафесара або вучоную ступень доктара навук. Кандыдаты па прадстаўленні дырэктара БДУ зацвярджаліся ўпраўленнем навучальных устаноў Наркамасветы БССР [11, арк. 7 зв.].

Такім чынам, пастанова здымала многія структурныя і кадравыя пытанні, але разам з тым залішне дэталізаваная рэгламентацыя ўсёй дзейнасці ўніверсітэта пазбаўляла ўніверсітэцкую адміністрацыю свабоды дзеянняў і самастойнасці.

5 верасня 1938 г. СНК СССР зацвердзіў «Тыпавы статут ВНУ» [12]. З гэтага моманту «Статут БДУ» быў асноўным юрыдычным дакументам, у якім фіксаваліся прававая падстава ўзнікнення і дата арганізацыі БДУ, ведамасная прыналежнасць, пералік спецыяльнасцей, па якіх вялася падрыхтоўка спецыялістаў, формы навучання, асноўныя прынцыпы прыёму ў ВНУ, наменклатура пасад прафесарска-выкладчыцкага складу і парадак іх замяшчэння, вызначаліся правы і абавязкі ўніверсітэцкай адміністрацыі, рэгламентаваліся паўнамоцтвы ўніверсітэцкага Савета і інш. [13].

Статутам 1938 г. была канчаткова замацавана мадэль кіравання Беларускім дзяржаўным універсітэтам.

Такім чынам, мадэль кіравання БДУ ў 1920–1930-х гг. мянялася разам са зменамі ў сістэме кіравання ўсёй вышэйшай школай СССР і праходзіла ў некалькі этапаў.

З 1921 да 1929 г. адбылася закладка падмурка кіруючай структуры ўніверсітэта, пашырылася кола рэгуляваных дзяржавай адміністрацыйных прызначэнняў, з'явіўся новы рэгламентуючы дакумент – «Палажэнне аб вышэйшых навучальных установах». Гэты перыяд характарызуецца больш аўтаномным развіццём БДУ (выбарнасць рэктара і дэканаў), магчымасцю вядзення самастойнай эканамічнай дзейнасці, дэмакратычным падыходам да прыняцця рашэнняў (дыскусіі, адкрытае галасаванне і інш.).

Пачынаючы з мая 1929 г. і да чэрвеня 1941 г. адзначаецца ўзмацненне дзяржаўнага ўздзеяння на вышэйшую адукацыю. У гэты час узрастае колькасць нарматыўна-прававых актаў, змест якіх становіцца сістэмным. Адбываецца ліквідацыя ўніверсітэцкай аўтаноміі. У БДУ было ўведзена адзінаначалле і адменена выбарнасць адміністрацыі. Прызначэнне кандыдатур на заняцце адміністрацыйных пасад ва ўніверсітэце ўзгадняецца з партарганізацыяй і Наркамасветы БССР. Уся структура кіравання строга рэгламентуецца вышэйстаячымі кіраўнічымі органамі Беларусі і СНК СССР.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). – Ф. 6. Воп. 1. Спр. 124.

2. *Яноўскі, А. А.* Памяць і слава: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. 1921–1941 / А. А. Яноўскі, С. М. Ходзін, М. Ф. Шумейка. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2006. – 383 с.

3. НАРБ. – Ф. 205. Воп. 1. Спр. 42.
4. НАРБ. – Ф. 205. Воп. 1. Спр. 72.
5. НАРБ. – Ф. 205. Воп. 1. Спр. 178.
6. НАРБ. – Ф. 205. Воп. 1. Спр. 373.
7. *Карпачев, М. Д.* Коренная реорганизация университетов в СССР в 1929–1933 гг. (по материалам Воронежского государственного университета) // М. Д. Карпачев / Новое прошлое. – 2016. – № 2. – С. 121–136.
8. Законы о вузах и техникумах. 1930–1938 гг. [Электронный ресурс] // Музей истории российских реформ им. П. А. Столыпина. – Режим доступа: http://xn--e1aaejmenocxq.xn--p1ai/node/13995 – Дата доступа: 30.10.2019.
9. *Яноўскі, А. А.* Гісторыя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў біяграфіях яго рэктараў / А. А. Яноўскі, А. Г. Зельскі. – Мінск: БДУ, 2001. – 320 с.
10. НАРБ. – Ф. 205. Воп. 1. Спр. 636.
11. НАРБ. – Ф. 205. Воп. 1. Спр. 670.
12. Типовой устав высшего учебного заведения. Утв. СНК СССР 5 сентября 1938 г. (СП СССР 1938 г. № 41, ст. 237) [Электронный ресурс] // Исторические материалы. – Режим доступа: http://istmat.info/node/24010. – Дата доступа: 10.11.2019.
13. НАРБ. – Ф. 205. Воп. 1. Спр. 716.

**(Дата падачы: 23.02.2024 г.)**

*Е. Н. Мох*
Академия образования, Минск

*E. Mokh*
Academy of Education, Minsk

**УДК 373.1(476)(091)**

## ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ НАУЧНО-ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКОГО ИНСТИТУТА ПЕДАГОГИКИ В БССР

## DEVELOPMENT OF THE RESEARCH INSTITUTE OF PEDAGOGY IN THE BSSR

*В статье рассматривается развитие научно-исследовательского института (НИИ) педагогики в БССР. Автором акцентируется внимание на то, что НИИ педагогики являлся центром развития педагогической мысли и образовательной практики, выполнял особую роль в восстановлении и развитии системы образования в послевоенный период.*

*Ключевые слова: научно-исследовательский институт педагогики; Национальный институт образования Министерства образования Республики Беларусь; научно-методическое обеспечение образовательного процесса.*

*The article examines the development of the research institute of pedagogy in the BSSR. The author focuses on the fact that the research institute was the center for the development of pedagogical thought and educational practice, and played a decisive role in the restoration and development of the education system in the post-war period.*